Звязда

11.12.2018

# Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека выйшла па-беларуску

Надзея Анісовіч

**10 снежня 1948 года была прынятая Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека. З таго часу сусветная супольнасць адзначае гэты дзень, бо ён нясе ідэю роўных магчымасцяў для кожнага, незалежна ад полу, расы і іншага. Учора, у 70-годдзе дэкларацыі, у Нацыянальную бібліятэку Беларусі перадалі выданне гэтага дакумента на беларускай мове.**

«Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, як і іншыя лёсавызначальныя тэксты ў гісторыі чалавецтва, менавіта на роднай мове мае для кожнага народа глыбокае значэнне, — сказаў **намеснік міністра замежных спраў Беларусі Андрэй ДАПКЮНАС.** — Усведамленне чалавекам сваіх неад'емных правоў і шчырае шанаванне ім матчынай мовы сугучны ў тым, што яны ідуць ад сэрца. І таму кожная дзяржава, якая разумее гэта, здольная як праз забеспячэнне эфектыўнай аховы правоў чалавека, так і праз зацікаўленую падтрымку роднага слова садзейнічаць невычэрпнай крыніцы грамадскай падтрымкі намаганняў дзяржавы на цярністым шляху дасягнення ўстойлівага развіцця грамадства, міру і бяспекі».

Намеснік міністра звярнуў увагу на тое, што дэкларацыя «дала разуменне ўсяму свету, што абарона роўнасці, справядлівасці, чалавечай годнасці — гэта агульны абавязак усіх краін і ўрадаў». Разам з тым супрацоўнік МЗС падкрэсліў, што, на жаль, яшчэ застаюцца мільёны людзей, якія дагэтуль пакутуюць з-за голаду, хвароб, жывуць ва ўмовах гвалту ці канфлікту, пазбаўленыя эфектыўных сродкаў прававой абароны.

Таксама Андрэй Дапкюнас упэўнены, што пытанні правоў чалавека неабходна разглядаць поруч з пытаннямі бяспекі і ўстойлівага развіцця. У нашай краіне многія добра знаёмы са зместам Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. «Аднак далучэнне да яе ідэй новых пакаленняў — гэта абавязак кожнай дзяржавы, кожнага з нас, дзяржаўных служачых, дыпламатаў, навукоўцаў, медыйных работнікаў, проста кожнага неабыякавага чалавека», — падкрэсліў намеснік міністра.

**Іаанна КАЗАНА-ВІШНЯВЕЦКІ, пастаянны каардынатар ААН і пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі,** расказала аб працы яе арганізацыі ў распаўсюджванні правоў чалавека ў розных галінах нашай краіны. У прыватнасці, закранула пытанні папярэджвання хатняга гвалту і аховы яго ахвяр, патрэб дзяцей і людзей з інваліднасцю. Яшчэ раз спадарыня Казана-Вішнявецкі нагадала аб працы з мігрантамі і бежанцамі ды іншымі групамі людзей, якім сёння патрэбна падтрымка.

## Загаловак у газеце: Правы чалавека: праца не скончана